**Каляндарна-абрадавыя песенныя традыцыі беларусаў як сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў (з вопыту работы фальклорнага ансамбля “Млынок”)**

*Мардань Дар’я Анатольеўна, педагог дадатковай адукацыі першай кваліфікацыйнай катэгорыі, кіраўнік фальклорнага ансамбля “Млынок”, магістр мастацтвазнаўства, аспірант БДУКіМ, дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска*

Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі на сучасным этапе – адна з галоўных задач дадатковай адукацыі, таму ставіцца да гэтай тэмы трэба вельмі адказна і прафесійна, бо менавіта ад педагога залежыць дакладнасць і глыбіня перададзеных ведаў. Нацыянальныя традыцыі адлюстроўваюць прыметы этнічных асаблівасцей, гісторыю народа, з дапамогай якіх чалавек суадносіць сябе з пэўным этнасам.

Паняцце “традыцыі” ўключае ў сябе асаблівасці працэсу перадачы каштоўнасцей з пакалення ў пакаленне, што фарміруе адносіны моладзі да мінулага. Традыцыі суправаджаюць чалавека ўсё жыццё, падтрымліваюць дух народа і не даюць загінуць нацыі. Многія даследчыкі разглядаюць паняцце “культура” менавіта праз сукупнасць традыцый, якія чалавецтва атрымала ў спадчыну ад мінулых пакаленняў (Б. Маліноўскі, С. Чарноўскі і інш.).

Абрад – адна з формаў рэалізацыі традыцый з пэўнымі рацыянальнымі, сімвалічнымі дзеяннямі, якія рэгулярна паўтараюцца. Каляндарна-абрадавыя песні суправаджалі працоўную дзейнасць і святы беларусаў на працягу года. Адсюль зразумела, што яны складаюць чатыры вялікія цыклы – веснавы, летні, восеньскі і зімовы. З іх можна вылучыць так званыя святы “Сонечнага крыжа” – чатыры галоўныя астранамічныя кропкі ў годзе: веснавое раўнадзенства (Дабравешчанне і Вялікдзень), летні сонцаварот (Купалле), восеньскае раўнадзенства (Багач і Дзяды), зімовы сонцаварот (Каляды). Пытанне вывучэння традыцыйнай культуры ў адукацыйным асяроддзі разглядаюць у сваіх навуковых працах вядучыя спецыялісты па фальклоры: З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева, В. М. Шарая, Р. М. Кавалёва, Т. А. Пладунова [5], Э. В. Шчадрына, Г. А. Барташэвіч [1], Т. І. Кухаронак [3].

Рэалізацыя этнакультурнага выхавання навучэнцаў фальклорнага ансамбля “Млынок” адбываецца па трох структурных накірунках: *народазнаўства, краязнаўства, народнае мастацтва (музычнае і харэаграфічнае). Краязнаўства* спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў пэўных уяўленняў аб прыродзе Беларусі, помніках культуры і архітэктуры; іх актыўнаму ўдзелу ў культуратворчай дзейнасці. *Народазнаўства і народнае мастацтва* ўключаюць спасціжэнне навучэнцамі роднай мовы, народнага календара, побыту беларусаў і пэўнага ладу іх жыцця; авалодванне народнымі звычаямі, абрадамі, традыцыямі, народным этыкетам. Беларуская мова з’яўляецца вызначальным элементам фарміравання асобы навучэнца як прадстаўніка пэўнага этнасу, спрыяе этнакультурнаму выхаванню. Разам з засваеннем мовы вядзецца работа па засваенні матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей этнічнай культуры. Гэтаму спрыяе вывучэнне этнічнай гісторыі, асаблівасцей

фарміравання культуры беларускага народа, разумення ролі беларускага народа ў гістарычным развіцці чалавецтва.

Аўтэнтычныя манеры выканання песень атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, таму вельмі важна працягваць традыцыі і знаёміць моладзь з культурнай спадчынай.

У сучасным гарадскім асяроддзі магчымасці пераймання архаічных узораў спеўных традыцый і зносін з носьбітамі (выканаўцамі аўтэнтычных песень) амаль адсутнічаюць, таму задача трансляцыі аўтэнтычнай манеры выканання песень належыць кіраўнікам фальклорных гурткоў. На занятках неабходна дэманстраваць адпаведныя аўдыя- і відэазапісы. Тэхнічныя сродкі забяспечваюць перадачу інфармацыі ад носьбіта да навучэнцаў і дазваляюць звяртацца да ўзораў спеўнай традыцыі неабходную колькасць разоў.

Пачынаць знаёміць і далучаць падрастаючае пакаленне да песенных традыцый, абрадаў і святаў беларусаў трэба яшчэ з ранняга ўзросту. Навучэнцы фальклорнага ансамбля “Млынок” вывучаюць на занятках асноўныя святы беларускага народнага календара, побытавыя танцы, народныя гульні. У навучанні ўмоўна можна вызначыць два напрамкі: вучэбны і выхаваўчы.

Вучэбны накірунак уключае знаёмства са святамі і абрадамі народнага календара, засваенне аўтэнтычнай манеры спеваў рэгіёнаў Беларусі. Аўтэнтычная манера спеваў мае своеасаблівую пазіцыю ў залежнасці ад рэгіёну, спецыяльную артыкуляцыйную ўстаноўку і характар голасавядзення. Важным працэсам з’яўляецца пастаноўка пеўчага дыхання і фарміраванне тэмбральнага слыху для ансамблевага выканання. Засваенне вучэбнай праграмы адбываецца ў непасрэднай узаемасувязі з рознымі відамі народнай творчасці, этнаграфіяй і міфалогіяй.

Фальклорныя традыцыі перадаюцца вусна, таму адным з асноўных метадаў навучання на занятках з’яўляецца наглядны метад – дэманстрацыя і выкарыстанне наглядных матэрыялаў. Традыцыйныя спевы і танцы засвойваюцца “з голасу на голас”, “з нагі на нагу”. Малодшае пакаленне спевакоў і танцораў, назіраючы за старэйшымі, вучыцца ў іх і пступова далучаецца да спеваў і танцаў (“рабі як я”). Такі спосаб перадачы забяспечвае арганічнасць, захаванне аўтэнтычнага стылю і манеры выканання. Пры навучанні дзяцей фальклору выкарыстоўваюцца матэрыялы экспедыцый, запісы этнографаў і этнамузыколагаў. Гэта садзейнічае знаёмству навучэнцаў калектыву з унікальнымі песнямі і танцамі.

Практычны матэрыял падбіраецца ў адпаведнасці з тэматыкай творчых заняткаў, з улікам узросту і ўзроўню падрыхтаванасці навучэнцаў. Відэа- і фотаматэрыялы аб беларускім народным касцюме, беларускіх народных танцах, песнях, музычных інструментах, святах, прыказкі і прымаўкі, загадкі, гульні, апісанне святаў і традыцый з’яўляюцца вельмі эфектыўнымі для набыцця ведаў, навыкаў і уменняў навучэнцаў.

Не менш значным метадам работы з навучэнцамі з’яўляецца аналіз педагагічных сітуацый на аснове народнай педагогікі (выхаваўчы патэнцыял абрадаў, песень і танцаў).

Пры навучанні важна выкарыстоўваць метад уключанага і апасродкаванага назірання з дапамогай аўдыя- і відэаапаратуры, ажыццяўляць мастацкае рэканструяванне абрадаў: ладзіць веснавыя і зімовыя святы “Гуканне вясны” і “Каляды”, абрад “Валачобніцтва”; вывучаць летні цыкл песень “Купалле”; аднаўляць восеньскія абрады “Жніво”, “Багач”, “Піліпаўка” і знаёміць з пазаабрадавымі песенямі.

Для больш якаснага авалодання навучэнцамі манерай аўтэнтычных спеваў выкарыстоўваецца метад этнафанічнага аналізу песень, у якім адлюстроўваецца спецыфіка дыялекту і маўлення розных рэгіёнаў. Пры вывучэнні новага матэрыялу выкарыстоўваецца методыка этнафанічнай транскрыпцыі, якую распрацавала Т. А. Пладунова.

Такім чынам, для эфектыўнай работы з научэнцамі пры засваенні песеннага матэрыялу выкарыстоўваюцца наступныя спецыяльныя метады:

1. метад тэхнічна апасродкаванага назірання (праслухоўванне аўтэнтычных песенных узораў з дапамогай тэхнічных сродкаў);
2. аналітычны (этнафанічны аналіз);
3. імітацыйна-імправізацыйны (дакладная інтэрпрэтацыя гучання этнафанічнага ўзору);
4. фанетычна-канцэнтрычны (паслядоўная інтэнсіўнасць тэсітуры выканання і тэмбравай палітры).

На сучасным этапе развіцця грамадства вывучаць песенныя традыцыі беларусаў немагчыма без укаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і лічбавых адукацыйных рэсурсаў. З мэтай азнаямлення навучэнцаў з абрадамі і манерай выканання спеваў розных рэгіёнаў да раздзела “Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў” праграммы гуртка “Млынок” *(Дадатак 1)* распрацаваны відэаагляды “Як гучыць Любаншчына” (абрад “Провады русалкі”) *(Дадатак 2)* і “Беларускі карнавал: Каляды” *(Дадатак 3).* Выкарыстанне відэаглядаў спрыяе развіццю цікавасці навучэнцаў да фальклорных экспедыцый.

Выхаваўчы накірунак дзейнасці фальклорнага ансамбля «Млынок» рэалізуецца праз удзел ў мерапрыемствах, народных святах, абрадах, гульнях. На канікулах з навучэнцамі дадаткова развучваюцца народныя гульні (напрыклад, “Явар”, “Казел”, “Журавель”, “Цяцерка” і інш.) і побытавыя танцы (“Ойра”, “Картузэ”, “Базар”, “Какетка”), якія ўдзельнікі гуртка выкарыстоўваюць на мерапрыемствах для навучання іншых дзяцей. Падыход “роўны навучае роўнага” дазваляе педагогу набыць актыўных і кампетэнтных памочнікаў.

Сумесна з фальклорным ансамблем “Жбанок” ЦДАДіМ “Маяк” г.Мінска (педагог Цярэня Г. С.) ладзіцца цеснае супрацоўніцтва з рознымі ўстановамі адукацыі: ДУА “Гімназія № 28 імя Уладзіміра Караткевіча г.Мінска”, ДУА ”Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі”, дзяржаўная сацыяльна-педагагічная ўстанова адукацыі “Дзіцячы гарадок Ленінскага раёна г.Мінска”, ДУА “Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі” і інш.

Шматлікія творчыя выступленні фальклорнага ансамбля “Млынок” на розных пляцоўках суправаджаюцца развучваннем і выкананнем традыцыйных

каляндарных абрадавых песень і гульняў. Напрыклад, пры правядзенні мерапрыемства “А ў нас сёння масленіца” выкарыстоўваліся гульні “Цяцерка”, бытавыя танцы “Ойра” і “Лявоніха”, масленічныя песні “А ў нас сёння масленка, масленка”, “Сядзелі дзеўкі на дошцы” і “Дзеці зіма із пад печы”.

Акрамя таго, калектывам праводзіцца актыўная дзейнасць па паглыбленні этнакультурных кампетэнцый настаўнікаў музыкі і спеваў г.Мінска. Так, навучэнцы фальклорных ансамбляў “Млынок” і “Жбанок” прынялі ўдзел у сумесным мерапрыемстве, падрыхтаваным ДУА “Гімназія №28 імя Уладзіміра Караткевіча г.Мінска” і ДУА “Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі” для настаўнікаў музыкі г.Мінска па пытанні актуальных праблем захавання і развіцця фальклору на ўроках музыкі і факультатыўных занятках. Калектывы прадэманстравалі фрагмент абраду “Провады русалкі” і аўтэнтычную манеру выканання абрадавых песень Любанскага раёна *(Дадатак 4).* У ДУА ”Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі” салісты фальклорнага ансамбля “Млынок” прадэманстравалі манеру аўтэнтычнага спеву на прыкладзе песень “Ой дайтэ мне раду”, “Бегла Калядка”, “Шчодрык”, паказалі беларускія танцы і гульні.

У завяршэнні можна сказаць, што адраджэнне фальклору, народных звычаяў, песень, абрадаў і святаў – актуальная праблема сучаснасці. Пераймание і распаўсюджванне каляндарна-абрадавых песенных традыцый беларусаў спрыяе рознабаковаму развіццю і выхаванню дзяцей розных узростаў, фарміраванню патрыётаў і грамадзян сваёй Айчыны. Таму вельмі важна перадаваць традыцыйныя асновы свойго народа, захоўваць і развіваць нацыянальную культуру.

## Спіс літаратуры

1. Барташэвіч, Г. А. Этнакультурныя традыцыі ў сучаснай сістэме выхавання / Г. А. Барташэвіч, У. Д. Каліноўскі // Кіраванне ў адукацыі. – 2012. – № 10. – С. 10-14.

2. Беларускі народны каляндар / аўтар-уклад. А. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.

3. Кухаронак, Т. І. Роля традыцыйнай культуры беларусаў у сучасным выхаваўчым працэсе / Т. І. Кухаронак // Народная спадчына Бацькаўшчыны: вывучэнне спадчыны і выхаванне дзяцей сродкамі аўтэнтычнага народнага мастацтва: Матэрыялы фальклорных чытанняў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2002. – С. 54-59.

4. Можейко, З. Я. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.

5. Пладунова, Т. А. Фальклор як экасістэма культуры (Да пытання этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі) / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: зборнік матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі / Т. А. Пладунова. – Мазыр : МазДПі імя Н.К. Крупскай, 2001. – С. 3-6.

6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Белар. навука : Выш. шк., 2001-2013.

**Дадатак 1**

Спасылка і QR код на пагpаму гуртка «МЛЫНОК» (мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны “Музычнае мастацтва”, накірунак “Фальклорны ансамбль”)

https://umk.mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/145/71533/doc/Млынок.%20Мардань%20Д.А..pdf

**Дадатак 2**

Спасылка на відэаагляд “Як гучыць Любаншчына” і метадычныя рэкамендацыі да відэаагляду “Як гучыць Любаншчына”

https://disk.yandex.ru/d/ZY3DAdrEwrD1Fg

https://umk.mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/140/73583/doc/ЦДОДиМ%20Маяк%20Мордань%20Д.А.%20Виртуальная%20экскурсия.pdf

**Дадатак 3**

Спасылка на відэаагляд “Беларускі карнавал: Каляды” і метадычныя рэкамендацыі да відэаагляду “Беларускі карнавал: Каляды”

https://drive.google.com/file/d/16whYZ-ihiMn7uJzXdzS4mo_KtW0P_oay/view?usp=sharing

https://umk.mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/140/76093/doc/%D0%9C%D0%BE%D1%80%D0%B4%D0%B0%D0%BD%D1%8C%20%D0%94.%20%D0%90.%20%D0%9A%D0%B0%D0%BB%D1%8F%D0%B4%D1%8B.pdf

**Дадатак 4**

Спасылка на Мінскі гарадскі метадычны партал ДУА “Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі”

http://mp.minsk.edu.by/main.aspx?guid=55423